Наталля Карнейчук



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

# ЛЕПШЫЯ З ЛЕПШЫХ XXXI РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ «БІБЛІЯТЭКА – АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ»

Вольга Какшынская



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

14 красавіка 2023 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) у анлайн-рэжыме былі падведзены вынікі XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2022 год.

Конкурс праводзіцца штогод сярод публічных бібліятэк краіны ў два этапы (абласны і рэспубліканскі) па чатырох намінацыях: «За пошукавую і даследчую працу», «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За падтрымку і развіццё чытання», «За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы». Спачатку пераможцаў вызначылі ў абласных бібліятэках, цэнтралізаванай сістэме дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска, цэнтралізаванай сістэме дзіцячых бібліятэк г. Мінска, і толькі пасля конкурсныя работы ацаніла журы на рэспубліканскім узроўні.

У склад журы конкурсу ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска.

У конкурсе прынялі ўдзел 39 публічных бібліятэк краіны: 17 цэнтральных бібліятэк і 22 бібліятэкі-філіялы.

Вызначэнне пераможцаў XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» адбывалася з дапамогай пісьмовага галасавання членаў журы. Напярэдадні пасяджэння кожны член журы запоўніў ліст галасавання, у якім былі пералічаны ўсе работы па кожнай з намінацый, адзначыў месца (першае, другое і трэцяе), якое неабходна прысудзіць вылучанай ім рабоце і прапанаваў бібліятэкі да заахвочвання. У мэтах атрымання аб'ектыўнай адзнакі члены журы не ацэньвалі матэрыялы сваёй вобласці.

Каб атрымаць найбольш аб'ектыўную адзнаку і ўлічыць усе выбары, зробленыя членамі журы, кожнаму выбару было прысвоена пэўнае значэнне: «заахвоціць» – 1, «3 месца» – 2, «2 месца» – 3, «1 месца» – 4. Выбар пераможцаў вызначаўся праз вылічэнне сярэдніх балаў. Тыя работы, што атрымалі найбольшы сярэдні бал, былі прапанаваны да ўзнагароджання.

Год ад года бібліятэкі дэманструюць усё больш высокі інфарматыўны ўзровень, культуру падачы матэрыялаў. Практычна кожная конкурсная работа змяшчала ўласныя распрацоўкі (праграмы, праекты, спасылкі на інфармацыйныя рэсурсы), рэкламную і інфармацыйную прадукцыю; суправаджалася электроннымі прэзентацыямі, відэаматэрыяламі, гульнёвымі праграмамі, сцэнарыямі і г. д. Вельмі ўразіў і пакінуў самыя найлепшыя водгукі ў членаў журы высокі мастацкі ўзровень прац удзельнікаў.

Па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеняў былі адзначаны 26 публічных бібліятэк, 4 бібліятэкі прадстаўлены да заахвочвання. Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 118 ад 26.05.2023 г. «Аб выніках XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Бібліятэкі-дыпламанты першай, другой і трэцяй ступеней атрымаюць грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна; бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання – 10 базавых велічынь.

Паведамім пра асноўныя дасягненні бібліятэк-пераможцаў, якія атрымалі дыпло-

мы першай ступені ў кожнай намінацыі. Даведацца аб усіх пераможцах конкурсу можна на партале НББ: https://www.nlb.by.

Лідарам па колькасці прадстаўленых работ стала **намінацыя «За падтрымку і развіццё чытання»** – 12 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла *ДУК «Астравецкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за папулярызацыю кнігі і чытання сярод гараджан рознага ўзросту і рэалізацыю мэтавай праграмы «Пазнай Астравеччыну»; стварэнне муралаў літаратараў – партрэтаў найбольш вядомых пісьменнікаў і арганізацыю тэатралізаваных пастановак іх твораў; стварэнне ў бібліятэцы інсталяванай краязнаўчай экспазіцыі і адкрыццё Жалудовай кавярні пры бібліятэцы.

Супрацоўнікі бібліятэкі актыўна займаюцца папулярызацыяй творчасці беларускіх аўтараў. Для чытачоў арганізавана «Майстэрня паэтычнага чытання», творчая сустрэча «Зямелькі роднай талент і натхненне» са Станіславам Валодзькам – беларускім паэтам, земляком, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі; праведзены акцыя «Чытаючы аўтобус», айстопер-акцыя «Вершы крочаць па планеце», краязнаўчая квэст-гульня «Пазнай Астравеччыну праз кнігу», літаратурныя падарожжы, турніры эрудытаў; распрацаваны цыкл літаратурна-краязнаўчых мерапрыемстваў «У культуры краю – душа народа».

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай стала *Елкаўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Зэльвенская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за распрацоўку і рэалізацыю літаратурна-адукацыйнага праекта «Я гэты край Радзімаю заву». Праект складаецца з некалькіх блокаў, адзін з якіх прысвечаны папулярызацыі творчасці беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Варта адзначыць ЧЫТАЙпраспект «Літаратурная палітра» з шэрагам сацыякультурных мерапрыемстваў: літаратурны марафон «Чараўнік беларускага слова», паэтычны калейдаскоп «Зямля мая, нябёсаў родных сінь»; спецыяльны цыкл заняткаў «Адкуль кніга на Беларусь прыйшла»; Дзень чытача беларускай кнігі; гучныя чытанні «Чытаем разам, чытаем услых!»; літаратурнае караоке «Край Радзімы навекі любімы» і г. д.

У **намінацыю «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** бібліятэкамі было даслана 11 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *Навагрудскай бібліятэцы сямейнага чытання – філіялу ДУК «Навагрудская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за плённую працу па падтрымцы традыцый сямейнага чытання. Бібліятэкай наладжаны цесныя сувязі з дашкольнымі і агульнаадукацыйнымі ўстановамі. Казачны куфэрак створаны для дзіцячых садкоў горада, для дзяцей малодшага школьнага ўзросту ў межах арт-студыі «Фабрыка ідэй» арганізавана творчая прастора «Карагод лялек». З дзецьмі сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту ў рамках праекта «Чытай пра край» вядзецца работа па выхаванні грамадзянскасці і патрыятызму, высокіх маральных якасцей, эстэтычнага густу; арганізавана серыя анлайн-трансляцый «Горад чытае пра свае» ў сацыяльных сетках установы; цыкл сустрэч у бібліятэцы «Чытаем добрыя кнігі».

Бібліятэка цесна супрацоўнічае з праваслаўнай царквой у межах мэтавай праграмы «Духоўнасць і кніга», ладзіць Чэмпіянаты па чытанні ўслых, забяспечвае функцыянаванне каворкінга «З татам нам цікава» і пальчыкавага тэатра, праводзіць для чытачоў гульні, вечарыны, казачныя карнавалы і г. д.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай прызнана *Александрыйская сельская бібліятэка ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Шклоўскага раёна» Магілёўскай вобласці* за змястоўную і шматгранную працу з дзецьмі па інавацыйным праекце летніх чытанняў «КНИГОсветное путешествие». Праект накіраваны на арганізацыю летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў праз гульню, кнігу і творчасць. Асновы малюнка, жывапісу, скрапбукінга і батыку дзеці засвойваюць у аматарскім аб'яднанні «АРТ-ДЭКОР», які неаднаразова станавіўся прызёрам міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і раённых творчых конкурсаў.

Бібліятэкар імкнецца стварыць умовы для ўсебаковага развіцця дзяцей: ладзіць мерапрыемствы, накіраваныя на выхаванне любові да родных мясцін і гонару за сваіх землякоў; актыўна займаецца экалагічным, духоўным і сямейным выхаваннем з дзецьмі і падлеткамі, папулярызацыяй здаровага ладу жыцця, папярэджаннем правапарушэнняў; дапамагае падлеткам зрабіць усвядомлены выбар будучай прафесіі.

У **намінацыю «За пошукавую і даследчую працу»** бібліятэкамі было прадстаўлена 9 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»* за стварэнне электроннага інфармацынага рэсурсу – інтэрактыўнай карты-энцыклапедыі «Godonim Hrodna» (2021–2022), якая адлюстроўвае ўсе аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны і сучасныя славутасці на тэрыторыі г. Гродна, знаёміць з лёсамі людзей і падзеямі, у гонар якіх названы вуліцы, плошчы, праспекты і завулкі.

Для работы з рэсурсам былі выкарыстаны даведачныя і краязнаўчыя рэсурсы бібліятэкі, афіцыйныя сайты прадпрыемстваў і арганізацый, друкаваныя выданні і электронныя публікацыі часопісў і газет, працы гісторыкаў, краязнаўцаў і г. д. У выніку атрымаўся цудоўны рэсурс, карысны ўсім, хто цікавіцца гісторыяй г. Гродна ў разрэзе яго гаданіміі, мае намер наведаць яго ў якасці турыста або з'яўляецца жыхаром, які любіць родны горад і хоча ведаць яго гісторыю і сучаснасць.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк лепшай адзначана *Сасноўская сельская бібліятэка ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»* за пошукавую і даследчую працу па вывучэнні малой радзімы і стварэнні гісторыка-публіцыстычнага нарыса «Памяці жыць!.. Старонкі гераічнага мінулага сасноўскага краю», дзе падрабязна адлюстраваны акупацыйны рэжым, а таксама станаўленне, развіцце і дзейнасць партызанскага, падпольнага руху на тэрыторыі в. Сасноўка і прылеглых вёсак у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У аснову нарыса ляглі ўспаміны старажылаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, публікацыі з газет і часопісаў аб баявых дзяяннях на тэрыторыі краю, успаміны былых вязняў, жыхароў акупаваных вёсак, архіўныя матэрыялы. Фарміраванне грамадзянскай актыўнасці, каштоўнасных адносін да падзей Вялікай Айчыннай вайны на прыкладах гераізму партызан і падпольшчыкаў – галоўная мэта нарыса.

У **намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** на разгляд журы было даслана 7 работ.

На першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк námінавана *Дзіцячая бібліятэка-філіял імя А.С. Пушкіна УК«Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва»* за стварэнне інфармацыйнага краязнаўчага рэсурсу «Дзецям аб Магілёве», які з'яўляецца візітнай карткай бібліятэкі. Эксклюзіўны медыяпрадукт па крязнаўстве ўяўляе сабой імправізаваную геаграфічную карту-пазл г. Магілёва з нанесенымі на яе тэматычнымі малюнкамі. Клікаючы на патрэбную карцінку, дзіця самастойна або пры дапамозе дарослага мае магчымасць атрымліваць неабходную інфармацыю, звязаную з г. Магілёвам. Інтэрнэт-рэсурс пастаянна папаўняецца і на сённяшні дзень складаецца з дзевяці раздзелаў.

Станоўчым вынікам рэалізацыі праекта з'яўляецца павышэнне іміджу бібліятэкі шляхам прадстаўлення матэрыялаў у найбольш сучаснай форме, што з'яўляецца пацвярджэннем развіцця бібліятэкі і выкарыстання ёю тэхнічных сродкаў для папулярызацыі кнігі, чытання і прыцягнення юных карыстальнікаў і іх бацькоў у бібліятэку.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, на конкурс была заяўлена толькі адна работа *Сасноўскай сельскай бібліятэкі-клуба ДУК «Смаргонская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці*, якая і была адзначана членамі журы. Бібліятэкар прадставіла комплексную работу па арганізацыі абслугоўвання чытачоў сваёй мясцовасці з выкарыстаннем як інавацыйных бібліятэчных, так і клубных форм работы.

Сваю дзейнасць бібліятэка-клуб арганізоўвае з дапамогай краязнаўчага бібліягіда «Кола гісторыі, ці вандроўка па родным краі», у межах якога быў створаны фальклорна-этнаграфічны пакой «Бабулін кут». Для папулярызацыі пакоя бібліятэкар распрацавала анлайн-віктарыну «Скарбы бабулінага куфра», якая размешчана на сайце раённай бібліятэкі; стварыла краязнаўчы электронны даведнік «Вытокі свае вывучаем»; выкарыстоўвае інавацыйныя формы работы пры абслугоўванні чытачоў: бібліятаксі «САСНОЎКАТУР.BY», краязнаўчы мабілограф «Таямніцы навакольных вёсак», паскрыптум-дайджэст «Дзённік сасноўскага падарожніка» і г. д.

І зноў конкурс працягваецца… Наперадзе вялікая і цікавая работа па набыцці новых каштоўных напрацовак і прафесійнага вопыту ў справе адраджэння нацыянальнай культуры, гісторыі, літаратуры, мовы, фальклорна-этнаграфічнай спадчыны.

Summary

The article summarizes the XXXI Republican contest "Library – center of national culture".